# ЦЯПЛО КНІЖНАГА СВЕТУ

***Наша родная Міншчына адзначае 70-годдзе. Юбілярка, а разам з ёй і мы, можам шмат чым ганарыцца.***

***Кожная кніжная скарбніца Міншчыны адметная і заслугоўвае ўвагі. Бібліятэка пасёлка Лясны размясцілася ў інтэрнаце. Плошча, адведзеная пад бібліятэку, выкарыстоўваецца надзвычай удала. І тут заўсёды пануе цёплая атмасфера, клапатліва створаная яе супрацоўнікамі.***

Бібліятэкары запрашаюць чытачоў не толькі па кнігі, часопісы і газеты, але і прапануюць далучыцца да створаных тут клубаў па інтарэсах. Так, для школьнікаў існуе некалькі аб'яднанняў. Адно з іх — "Сузор'е талентаў", якім кіруе загадчыца бібліятэкі Марына Даміно.

Клубам "Ровесник" кіруе Любоў Адамовіч. Падлеткі з задавальненнем збіраюцца на сустрэчы, падчас якіх праходзяць цікавыя гутаркі-развагі, віктарыны і вечары паэзіі.

Для першакласнікаў створана школа духоўнасці "Познавай-ка", дзейнасць якой скіравана на тое, каб зацікавіць дзяцей кнігай, прывіць любоў да чытання. Школьнікам 3-5-х класаў прапануюць далучыцца да клуба "Аука", які мае экалагічны накірунак.

Асабліва хочацца адзначыць клуб "Сямейны свет", які таксама ўзначальвае загадчыца бібліятэкі Марына Даміно. Гэта аб'яднанне ставіць за мэту духоўнае адраджэнне сям'і.

Для сталых людзей створаны клуб "Залаты ўзрост", якім кіруе Ганна Навахрост. За кубкам гарбаты вядуцца прыемныя гутаркі, абмяркоўваюцца розныя пытанні, праводзяцца мерапрыемствы.

Такая шматпланавая работа прываблівае чытача. Наведвальнікі адзначаюць багатыя фонды бібліятэкі, добразычлівасць і стараннасць супрацоўнікаў.



*НА ЗДЫМКУ: загадчыца бібліятэкай п.Лясны Марына Даміно прадстаўляе новыя літаратурныя паступленні.*

**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ.**

**Прысталічча. – 2008. – 16 студзеня. – С.5.**